# Па новыя ўражанні

**BelBookChallenge ў гонар 90-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча запускае Нацыянальная бібліятэка Беларусі. З 17 кастрычніка да 27 снежня ўдзельнікі бліжэй пазнаёмяцца з сучаснай беларускай літаратурай, чытаючы творы па 12 тэмах, пад якія падыходзяць дзясяткі кніг. І ў тым ліку — творы Уладзіміра Караткевіча.**

Кнігі павінны належаць беларускім аўтарам або быць перакладзенымі на беларускую мову. У спісе тэм — кніга, намініраваная на літаратурную прэмію, кніга, якую параіць бібліятэкар, антыўтопія ў беларускіх дэкарацыях, твор, дзе фігуруе Кастусь Каліноўскі, кніга пра неўзаемнае каханне мужчыны да жанчыны, твор з героем дысідэнтам, зборнік паэзіі верлібраў, выданне з пераважна белай вокладкай, зборнік любоўнай лірыкі, кніга, што падабалася ў дзяцінстве, пераклад замежнай класікі і пераклад з рускай мовы.

Пачаць чэлендж можна ў любы дзень, а прытрымлівацца спіса — у любой паслядоўнасці. Пасля прачытання кожнай кнігі трэба пакінуць водгук на яе ў сацыяльных сетках (УКантакце, *Facebook* або *Instagram*) з хэштэгам *#BelBookChallenge*. Як адзначаюць арганізатары, рэцэнзіі будуць публікавацца на старонках Нацыянальнай бібліятэкі ў сацсетках, а найлепшыя чытацкія водгукі з'явяцца ў канцы чэленджа ў выглядзе асобнай падборкі. Акрамя таго, на працягу ўсёй акцыі будуць складацца падборкі рэкамендацый па кожнай з тэм. Самых актыўных удзельнікаў чакае прыз ад бібліятэкі.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**